# Эканоміка на "зялёных прынцыпах"

**У Гомелі наладзілі вытворчасць першай у Беларусі экалагічна бяспечнай ахаладжальнай вадкасці для рухавікоў унутранага згарання**

Гаворка ідзе пра запуск у ААТ “Гомельхімгандаль” лініі па вытворчасці першага ў Беларусі экалагічна бяспечнага антыфрызу. Магутнасці новай лініі дазволяць выпрацоўваць 1000 тон новага прадукту ў год.

Вытворчасць запушчана пілотнай ініцыятывай “Экалагічная бяспека ахаладжальных вадкасцяў для рухавікоў унутранага згарання” у рамках праекта “Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да “зялёнай” эканомікі”, які фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН у партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь. Рэалізацыю ініцыятывы забяспечыла партнёрства арганізацый “Садзейнічанне развіццю бізнесу” і “Гомельхімгандаль”.

Вытворчасць першай у Беларусі экалагічна бяспечнай ахаладжальнай вадкасці для рухавікоў унутранага згарання дасць магчымасць вырашыць праблему ўтылізацыі выкарыстаных атрутных рэчываў і тым самым знізіць нагрузку на навакольнае асяроддзе. Беларускія аўтаўладальнікі атрымаюць магчымасць прымяняць экалагічна бяспечны антыфрыз, які не назапашваецца у тебе пры яго замене. Акрамя таго, рэалізацыя ініцыятывы таксама дазволіла стварыць новыя працоўныя месцы на вытворчасці экалагічна бяспечных ахаладжальных вадкасцяў.

Узоры новага прадукту “Антыфрыз ЭКА-100” ужо прайшлі лабараторныя даследаванні на прадпрыемстве “Навукова-практычны цэнтр гігіены”, дзе была пацверджана яго экалагічная бяспека. Па выніках тэстаў новы антыфрыз быў аднесены да маланебяспечных хімічных кампазіцый. Адметнай асаблівасцю прадукту з’яўляецца тое, што ён не патрабуе ўтылізацыі здольны замяніць больш дарагія імпартныя аналагі. Гэта дае магчымасць зменшыць фінансавую нагрузку на прадпрыемствы за кошт таго, што неабходнасць ва ўтылізацыі адпрацаванага антыфрызу адпадае.

Для адкрыцця вытворчасці экалагічна бяспечнага антыфрызу арганізацыяй “Садзейнічанне развіццю бізнесу” за кошт сродкаў Еўрапейскага саюза было закуплена і ўстаноўлена 13 пазіцый абсталявання, уключаючы пяць адзінак унікальнага.

У рамках рэалізацыі гэтай пілотнай ініцыятывы былі распрацаваны юрыдычныя і кіраўніцкія дакументы, якія спрыяюць наладжванню збыту экалагічна бяспечных антыфрызаў і забяспечваюць будову кіравання экалагічна бяспечнай вытворчасцю.

**Уладзімір Міхайлаў**

**Источник:** Беларусь. — 2017. — № 9. — С. 22-23.